УДК 272/273+94(476)“1941/44”

# ПРАВАСЛАЎНАЯ ЦАРКВА Ў ГОРАДЗЕ БРЭСЦЕ ПАДЧАС АКУПАЦЫІ 1941–1944 ГАДОЎ

**П. А. Гаўрылюк**
*студэнтка гістарычнага факультэта*
*Навуковы кіраўнік* **Я. С. Разэнблат**, *кандыдат гістарычных навук, доцент*
*Беларусь, г. Брэст, БрДУ імя А. С. Пушкіна*

*Анатацыя:* У дадзеным дакладзе разглядаецца месца Праваслаўнай Царквы ў структуры акупацыйнага рэжыму горада Брэста ў 1941–1944 гады, асаблівасці і ўмовы яе дзейнасці, стаўленне акупацыйных улад да царкоўных спраў.

*Ключавыя словы*: Вялікая Айчыная вайна; акупацыя; Брэст; праваслаўная царква; рэлігія.

Адразу пасля нападу нямецкіх войск на СССР 22 чэрвеня 1941 года ў горадзе Брэсце быў усталяваны акупацыйны рэжым. Ён прадугледжваў кантраляванне амаль усіх сфер жыцця чалавека: эканамічнай, палітычнай, культурнай і, ў тым ліку, духоўнай.

Асаблівасцю рэлігійнага жыцця ў горадзе было панаванне хрысціянскай царквы. Пасля даволі доўгага перыяда паланізацыі 1921–1939 гадоў, які прадугледжваў таксама дамінаванне рымска-каталіцкага касцёла, у Брэсце жыло шмат католікоў, а дзейнасць праваслаўнай царквы не была так зруйнавана, як на ўсходніх тэрыторыях Беларусі падчас актыўнай атэістычнай дзейнасці савецкай улады.

У 1941 годзе жыццё праваслаўных гараджан Брэста канцэнтравалася ў наступных рэлігійных арганізацыях [1, с. 36]:

1) Свята-Сімяонаўскі сабор;

2) Свята-Мікалаеўская брацкая царква;

Яны былі зарэгістраваны і дзейнічалі з дазволу акупацыйнай адміністрацыі. Трэба адзначыць, што кантроль за рэлігійнымі справамі не ўваходзіў у кампетэнцыі ніводнага з аддзелаў магістрата. Таму царкву падчас акупцыі можна лічыць адносна самастойнай структурай, аднак яна не магла дзейнічаць без пагаднення з акупацыйнымі ўладамі. Сам камісар Брэст-Літоўскай акругі ў справаздачы за лістапад 1941 года пісаў наступным чынам: «Хотя не в наших интересах, чтобы все жители ортодоксального вероисповедания были едины, однако нельзя допускать того, чтобы все жители ортодоксального вероисповедания знали об этом» [1, с. 36].

Напярэдадні вайны праваслаўная царква на тэрыторыі Берасцейшчыны засталася без кіраўніка [2, с. 41]. Трэба адзначыць, што на ўкраінскіх тэрыторыях дзейнічала Украінская Аўтаномная Праваслаўная Царква (яна прызнавала кананічнае падпарадкаванне Маскоўскай Патрыярхіі) і Украінская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Гэта распаўсюджвалася і на Брэст, які адносіўся да рэйхскамісарыята «Украіна». Немцы не імкнуліся да аб'яднання гэтых цэркваў і не перашкаджалі іх дзейнасці [3, с. 423–453]. Узначаліў царкоўнае кіраванне Брэсцкай праваслаўнай епархіяй аўтаномнай УПЦ епіскап Брэста і Ковеля Іоанн Лаўрыненка, які ў маі 1942 года праводзіў канферэнцыю духавенства горада Брэст-Літоўска і блізкіх тэрыторый [4, с. 209]. Цікавы той факт, што па перапісу 1942 года ў горадзе пражывала 1556 украінцаў і 2494 рускіх [4, с. 44], але рух за далучэнне да аўтакефальнай праваслаўнай царквы Украіны быў даволі актыўны [2, с. 41].

Акрамя таго рэйхскамісар Украіны скардзіўся, што праваслаўныя даволі часта не выходзяць на працу з-за вялікай колькасці рэлігійных святаў, таму забараніў парушаць такім чынам унутраны працоўны распарадак, акрамя святкавання Раства, Новага года і Вялікдня [4, с. 26].

Настаяцелем Свята-Сімяонаўскага сабору, пры якім працавала Брэсцкае духоўнае праўленне Палесскай епархіі, быў мітрат Стэфан Жукоўскі. 14 снежня 1941 года пры Украінскім Камітэце Узаемадапамогі ствараўся царкоўны савет і гэты святар называецца першым у спісе абраных членаў прэзідыўма гэтага савета [4, с. 207]. Калі мітрапаліт Пінскі і Палескі Аляксандр (аўтанаміст) 7 кастрычніка 1942 года праездам наведаў Брэст, Жукоўскі нават пакінуў яму месца для начлегу [4, с. 210]. Згодна са спісам, накіраваным да харчовага аддзела ў кастрычніку 1942 года, у царкве працавала 9 чалавек: святар, два вікарыя, д'якан, псалмапевец, апякун сабора, апякун могілак і стораж могілак [5, арк. 9]. У 1943 годзе мітрат Жукоўскі быў вызвалены з пасады і арыштаваны

[1, с. 36], пасля чаго яго абавязкі, згодна з аналагічным спісам, але ўжо ліпеня 1943 года, выконваў адзін з вікарыяў Барыс Сабалеўскі. У гэтым дакуменце таксама згадваецца 9 чалавек, але супадае з папярэднім спісам толькі 5 імён [5, арк. 7]. Праз некалькі месяцаў, у кастрычніку 1943 года, харчоваму аддзелу накіроўваецца новы спіс асоб духоўнага звання і слухачоў Брацкага Сімяонаўскага сабору (менавіта так напісана ў дакуменце). У ім ужо пералічана 14 чалавек і сярод іх няма Барыса Сабалеўскага, а першым у спісе пазначаны архіепіскап Лаўрыненка Іоанн. Акрамя святароў там былі запісаны іх жонкі і нават дзеці [5, арк. 31]. У адной з нататак мясцовай украінскай газеты «Наша Слова» згадваецца, што 2 лютага 1943 года сабор перадаў камісару Брэсцкай акругі 2000 карбованцаў на дабрачынныя мэты [4, с. 211]. З матэрыялаў вуснай гісторыі можна даведацца, што святары Свята-Сімяонаўскай царквы працавалі ў храмах навокал горада. Напрыклад, настаяцелем царквы ў Гершонах быў Тарыма Міхаіл, які не падтрымліваў савецкую ўладу і пасля вайны быў арыштаваны [6]. Усі рэспандэнты казалі, што рэлігія зноў стала легальнай і працавалі касцёлы і цэрквы.

Аб колькасці працаўнікоў Свята-Мікалаеўскай брацкай царквы Палескай епархіі таксама можна даведацца са спіса да харчовага аддзела магістрата, але недатаванага. У дакуменце згадваецца 5 чалавек: святар, д’якан, псалмапевец, апякун царквы і стораж царквы. Пад дакументам падпісаўся святар Мітрафан Зноско [5, арк. 4]. Менавіта ён і быў настаяцелем сабору і прыхільнікам аўтаномнай царквы [7].

Такім чынам можна зрабіць высновы, што нацыянальная палітыка ў адносінах да цэркваў у Брэсце падчас акупацыі ў 1941 – 1944 гадах праводзілася ў русле агульнацаркоўнай палітыкі немцаў і мела сітуатыўны характар, у залежнасці ад тэрытарыяльнага складу. Немцы не забаранялі дзейнасць рэлігійных арганізацый і адначасова не давалі ім поўнай свабоды. У выніку ўваходжання Брэста ў склад рэйхскамісарыяту «Украіна» царква была падвергнута ўкраінізацыі. Гэта праявілася ў актыўным уплыве аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы Украіны на рэлігійнае жыццё і захаванне аўтаномнай царквы Украіны. Гэты падзел падтрымлівалі акупацыйныя ўлады, якія выкарыстоўвалі супярэчнасці ўнутры праваслаўнай царквы для разлучэння грамадства.

**Спіс крыніц і літаратуры:**

1. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Брэста. У 2 кн. Кн. 2-я. – Мінск : БЕЛТА, 1998. – 574 с.

2. Силова, С. В. Православная церковь на Беларуси в годы Великой Отечественной войны (1941–1945 г.) / С. В. Силова // Веснік ГрДУ імя Янкі Купалы. Сер. 1. – 1999. – № 2. – С. 36–46.

3. Шкаровский, М. В. Крест и свастика. Нацистская Германия и Православная Церковь / М. В. Шкаровский. – М. : Вече, 2007. – 512 с.

4. Брест в 1941 – 1944 гг. Оккупация: документы и материалы / Учрежд. «Государственный архив Брестской области»; сост. Г. Д. Калустова, А. Г. Карапузова, Е. С. Розенблат. – Брест : Альтернатива, 2016. – 316 с.

5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 201. Воп. 1. С. 1042.

6. Зданевіч, А. Д. Інтэрв’ю / Аўдыёзапіс. – Архіў кафедры ўсеагульнай гісторыі БрДУ.

7. Из истории нашего храма // Официальный сайт братской Свято-Никольской церкви города Бреста : [сайт]. – URL: http://stnikolas.hram.by/sait/rus/html/ec_enoidee_odaia.HTM (дата обращения: 29.10.2024).